

ДОЎГІ ШЛЯХ ДАДОМУ

5

ЯК ЗДЫМАЛІ «БЕЛЫЯ РОСЫ»

13



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

1 ЛІПЕНЯ 2023 г. СУБОТА № 125 (30005)

# Наш галоўны дзень!

## ДАРАГІЯ СУАЙЧЫННІКІ!

З ліпеня наша краіна адзначае Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь (Дзень Рэспублікі).

Гэтае свята — даніна пакаленням беларусаў, якія на працягу стагоддзяў адстойвалі права жыць на роднай зямлі і самастойна вызначаць уласны лёс. Гэтае свята захоўвае памяць аб беспрыкладным подзвігу беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Дэманструе гістарычную сталасць, нацыянальную годнасць і цвёрдую волю спадкаемцаў народа-пераможцы ўмацоўваць сваю дзяржаўнасць.

Выбраўшы шлях пераемнага развіцця, мы захавалі і прымножылі найлепшыя дасягненні савецкага перыяду, асвойваем сучасныя высокатэхналагічныя галіны эканомікі. Нягледзячы на беспрэцэдэнтныя выклікі часу, забяспечваем сацыяльныя гарантыі і магчымасці для самарэалізацыі кожнаму грамадзяніну.

Сфарміраваны за гады незалежнасці духоўны, маральны, інтэлектуальны, эканамічны базіс дазваляе нам з упэўненасцю глядзець у будучыню. А народнае адзінства, добрасумленная праца і беражлівыя адносіны да сваёй зямлі з'яўляюцца залогам дасягнення самых запаветных мэт.

Жадаю ўсім моцнага здароўя, шчасця, міру і дабрабыту.

Са святам, дарагія сябры! З Днём Незалежнасці!

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

З першых вуснаў

## «НАША ШТОДЗЁННАЯ ПРАЦА — І ЁСЦЬ ЦАНА НЕЗАЛЕЖНАСЦІ»



Фота БелТА.

### Выступленне Аляксандра Лукашэнкі на ўрачыстым сходзе ў гонар Дня Незалежнасці

Дарагія суайчыннікі!

Паважаныя ветэраны, сябры!

Віншую вас з Днём Незалежнасці Рэспублікі Беларусь, вялікім святам нашай краіны, сугучным з Днём Перамогі.

У Год міру і стваральнай працы гэты дзень набывае асаблівы сэнс. Да сваёй незалежнасці беларусы ішлі праз войны, самаадданыя подзвігі і вялізную працу.

Пакаленне, якое падарыла Вялікую Перамогу, падарыла нам свабоду і мір цаной сваіх жыццяў. Мільёнаў жыццяў.

Мы будзем гаварыць і памятаць пра гэта заўсёды і перадаваць гэтыя веды новаму народжанаму на нашай зямлі грамадзяніну. Бо 3 ліпеня, у дзень вызвалення Мінска ад нямецка-фашысцкіх акупантаў, змучаныя нявoляй, дзікімі катаваннямі, стратамі родных і блізкіх, беларусы вярнуліся да жыцця.

Няма і не можа быць іншага сэнсу ў гэтага свята. Няма і не можа быць іншай даты, як бы ні марылі нашчадкі нацыстаў там і іх памагатыя тут.

Для нас, сапраўдных беларусаў, Дзень Незалежнасці — гэта дзень, які набліжае Перамогу савецкага народа над фашысцкай Нямеччынай.

Дарагія ветэраны вайны і працы!

Мы, усе, хто нарадзіўся ў гады вайны і пасля, у неаплатным даўгу перад вамі. Нам пашанцавала быць дзецьмі і ўнукамі такіх мужных і валявых людзей, як вы, — сапраўдных патрыётаў.

Нам пашанцавала расці і выхоўвацца на прыкладзе ваенных і працоўных подзвігаў вашага гераічнага пакалення. Пакаленне, якое навучыла нас трымаць удар, жыць па сумленні і па справядлівасці.

Дай Бог вам здароўя і бадзёрасці! Дай Бог нам як мага даўжэй мець магчымасць гаварыць вам словы бясконцай падзякі, віншаваць вас з гэтым вялікім святам, якое вы нам падарылі.

*(Апладысменты.)*

Вы змагаліся на палях ваенных бітваў. Ваша Перамога на многія дзесяцігоддзі наперад забяспечыла мір краінам і кантынентам. Але гэты свет вычарпаў свой запас трываласці. Сёння наш час выканаць сваю гістарычную місію. Цяпер мы б'ёмся за гэты мір. Як бачыце, б'ёмся на інфармацыйным, эканамічным, палітычным франтах.

Так, гэтую вайну не ўсе бачаць і не ўсе ўсведамляюць. Так, на ёй не рвуцца снарады, не свішчуць кулі. Але ўсё гэтак жа нас жадаюць паставіць на калені і знішчыць.

Чаму ж Захад зноў лепіць з нас ворага?

Нас баяцца. Не ў тым сэнсе, што мы «агрэсары» і збіраемся на кагосьці нападаць, заняволіць. Мы для іх небяспечныя аўтарытэтам, самастойнасцю і сілай беларускай дзяржавы. У рэшце рэшт, і гэта самае галоўнае, — сваім прыкладам.

Прыкладам адсутнасці прорвы паміж багатымі і беднымі, прыкладам сацыяльнай абароненасці ўсіх грамадзян, прыкладам здаровага грамадства і традыцыйных каштоўнасцяў. І многімі іншымі дасягненнямі беларускага народа, якія імпануюць простым еўрапейцам і амерыканцам.

СТАР. 2




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ISSN 1990 — 763X



# «НАША ШТОДЗЁННАЯ ПРАЦА — І ЁСЦЬ ЦАНА НЕЗАЛЕЖНАСЦІ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Заходнім элітам страшна, што заўтра іхнія народы выйдуць на вуліцы і скажуць канчатковае «не» неаліберальным каштоўнасцям. Яны ўжо там. Толькі нам праз іх СМІ не гавораць, супраць чаго ў Францыі, Бельгіі, іншых краінах змагаюцца звычайныя людзі. Яны змагаюцца, каб сказаць «не». Яны хочуць нармальна жыць... (Сказаць «не». — **«Зв.»**) каштоўнасцям, якія дзеляць грамадства на касты, даюць прывілеі абраным, кідаюць народы ў амаральную, бездухоўную прорву ў пагоні за нажывай. Гэта ўсё іх.

Мацней за гэты страх — англасаксонская сквапнасць і прага заваёў, вядомая з найстаражытнейшых часоў. Прыродныя багацці і абшары ўсходнеславянскіх земляў да гэтага часу не даюць ім заснуць.

Вірус нянавісці да ўсяго славянскага перадаецца з пакалення ў пакаленне. Разам са словамі «раб» і «славянін», якія ў мовах ад англійскай і нямецкай да шведскай і французскай гучаць практычна ідэнтычна, аднолькава.

Нецярпімасць заходніх палітыкаў да нашых каштоўнасцяў, іх разлікі на нашы рэсурсы матэрыяльныя і чалавечыя — гэта выклікі. Выклікі нашай дзяржаўнасці і суверэнітэту. Думаю, вы гэта разумееце.

Мы сабраліся з нагоды Дня Незалежнасці напярэдадні ўсіх святочных мерапрыемстваў. Гэта дазваляе нам узняць у тым ліку несвяточныя тэмы і звярнуцца не толькі да нашых людзей.

Сітуацыю вы ведаеце. Мы знаходзімся ва ўмовах беспрэцэдэнтнага ў гісторыі чалавецтва ваенна-палітычнага крызісу сусветнага маштабу. Дыялог па яго ўрэгуляванні Захаду не патрэбны. Ім не патрэбен дыялог. Пакуль.

Ва Украіне і так усё развіваецца па іх сцэнарыі. Дзяржперараварот у 2014 годзе адбыўся, укладзеныя ў падрыхтоўку грошы адбіты. Рускіх у Данбасе пачалі забіваць — таксама па плане ў свой час. А тое, што адбываецца сёння, — проста падарунак усяму заходнееўрапейскаму істэблішменту.

Цяпер краіны Еўрасаюза, Злучаныя Штаты Амерыкі паскоранымі тэмпамі ўзбройваюць нашу суседку Польшчу. Такім чынам ствараецца яшчэ адзін ачаг напружанасці, ствараецца яшчэ адзін апорны пункт для агрэсіі самай агрэсіўнай краіны ў свеце і, на жаль, самай магутнай — Злучаных Штатаў Амерыкі. Гэта значыць, робіць з яе (Польшчы. — **«Зв.»**) наступны пасля Украіны проксі-палігон у супрацьстаянні з намі, з Расіяй.

Польскаму ўраду варта падумаць сваёй галавой. І перш за ўсё аб сваім народзе. Для Захаду палякі былі і застаюцца славянамі. А гэта — расходны матэрыял. Вучыце гісторыю, суседзі.

Найбліжэйшыя да нас краіны Балтыі проста дзівяць сваёй самагубнай упартасцю ў імкненні стаць ударным атрадам НАТА. Але ростам, відаць, не выйшлі. Пакуль ім адведзена роля падпявалаў і правакатараў.

Так, шаноўныя сябры, гэта рэаліі. Але рэальнасць і ў тым, што яны нашы суседзі. Там жывуць людзі, падобныя да нас. Таму, нягледзячы на вар'яцтва палітыкаў суседніх краін, мы абавязаны з імі жыць хаця б у «дрэнным міры».

Нашаму ўраду, Міністэрству замежных спраў трэба прапанаваць ім план добрасуседства і міру.

Мы чарговы раз працягваем вам руку міралюбнасці не таму, што спалохаліся вашых «палкоў» і «харугваў». Мэты іх нікчэмныя і планы вар'яцкія!

Як і ў гады Вялікай Айчыннай вайны, у здраднікаў і калабарацыяністаў не знайшлося такой колькасці душ, каб сфарміраваць з іх «вызваленчае войска».

У Вялікую Айчынную падобныя зборышчы выдаваліся за беларускіх партызан, якія ваююць з камуністычным рэжымам. Для ўсіх гэта ўсё скончылася трагічна — трыбуналам і эшафотам. Для тых, хто схаваўся і каго схавалі за акіянам, — забыццём і няслаўем.

Калі нехта хоча паўтарыць — гэта іх выбар. Не самы разумны, улічваючы, як змяніўся расклад сіл.

Інтрыга ва ўсёй гэтай гісторыі толькі адна: ці ўсведамляюць заходнія палітыкі, што яны ўласнымі рукамі кладуць галаву Еўропы на ядзерную гільяціну? Яны сур'ёзна думаюць, што абыдуцца малой ахвярай? Не дай бог успыхне самая страшная ў гісторыі вайна, — не проста будзе горача ў Варшаве, Кіеве ці Вільнюсе. Знікнем мы, Еўропа як цывілізацыя. Ну ім жа гэта не трэба. Нам таксама.

Беларусь, Расія ў такім зыходзе катэгарычна не зацікаўлены.

Бо, па сутнасці, нават адрозніваючыся нацыянальнымі інтарэсамі, каштоўнасцямі, традыцыямі, мы, краіны Усходняй і Заходняй Еўропы — нашага агульнага дома, маглі б і павінны развівацца разам. Мы можам быць цікавыя і карысныя адна адной ва ўсіх сферах — эканамічнай, навуковай, адукацыйнай, культурнай.

У нас і праблем хапае. Але таксама агульных. Клімат мяняецца, мы ледзь не кожны год змагаемся за ўраджай. Цэлая куча энергетычных пытанняў, доступ да рэсурсаў, у тым ліку і працоўных. Дэмаграфічная сітуацыя. Рост экстрэмізму, кіберзлачыннасці. Заходнюю Еўропу накрывае хваляй міграцыйнага крызісу. Рана ці позна яна захопіць і ўсходнюю частку.

Нам трэба супрацоўнічаць і памятаць: якія б мускулы, які б ваенны патэнцыял мы ні нарошчвалі, якія б тэхналогіі ні развівалі — мы не мацнейшыя за прыроду. Пандэмія ўжо паставіла ўсіх на месца. А што будзе далей? Што яшчэ можа выйсці з біялабараторый, якія былі раскіданыя па ўсёй еўразійскай прасторы?

Мы зноў нібы забыліся, што не ўсё залежыць ад нас. Што мы пясчынкі ў Сусвеце, а нашы геапалітычныя гульні — пыл. Трэба спыніцца, пакуль не позна.

Мы па-ранейшаму заклікаем да міру. У глабальным сэнсе.

Але калі дзяржаўнасць, незалежнасць, тэрытарыяльная цэласнасць, бяспека нашых народаў акажуцца пад рэальнай пагрозай, мы, нават не разважаючы, адкажам адэкватна. Не выпрабоўвайце наша славянскае цярпенне і свой лёс.

Цяпер стала модна казаць пра цэнтры прыняцця рашэнняў. Дык вось, каардынаты гэтых цэнтраў нам да міліметра вядомыя. І пазаўчора яны дакладна і ясна вызначаны і зацверджаны мною на ваенных картах.

Трэба садзіцца за стол перагавораў і пачынаць выбудоўваць новую сістэму бяспекі ў рэгіёне. Я даўно да гэтага заклікаю. І давайце мірна ствараць на карысць нашых народаў.

Дарагія беларусы!

Мы знаходзімся ў самым цэнтры Еўропы. І ў цэнтры старажытнай гісторыі. Тысячу гадоў таму тут кіпела жыццё.

Ужо тады нашы далёкія продкі, славяне, на гэтым лапіку зямлі стваралі асновы нацыянальнай беларускай дзяржаўнасці. Стваралі ў бітвах за сваю зямлю, за волю, за свае народ і жыццё. І мы праігнараваць гэта не зможам.

Як бы ні было сёння цяжка, якімі б ні былі сучасныя рызыкі і пагрозы, нам з вамі ўсё ж выпала шчасце будаваць сваю будучыню выключна ў інтэлектуальных і працоўных бітвах. І мы цэнім гэты шанц. Мы ствараем.

Я дзякую ўсім вам, беларусам, за вашу працу.

У першую чаргу вяскоўцам. Вас амаль утрая менш, чым было напярэдадні набыцця незалежнасці і распаду вялікай краіны. У тры разы менш. Але вырабляеце ў паўтара раза больш збожжа, значна прыбавілі ў вытворчасці прадуктаў харчавання.

Мы поўнасцю забяспечваем сябе неабходнай для палёў і ферм тэхнікай.

Дзякуй усім, хто працуе ў прамысловасці, галінах інавацыйных і тэхналагічных распрацовак.

У тым ліку дзякуючы вам Беларусь сярод лідараў па вытворчасці сельгастэхнікі, грузавых аўтамабіляў і кар'ерных самазвалаў.

На кожным з нашых гігантаў сёння выпускаюцца топавыя машыны, такія як беспілотны трактар і самы вялікі ў свеце грузавік, высокадакладнае абсталяванне, станкі і многае іншае.

Наша навука ў многіх абласцях знаходзіцца на вядучых, перадавых пазіцыях.

Распрацоўваем і вырабляем унікальныя прыборы, прамысловае і медыцынскае абсталяванне, электратранспарт. Павышаем сваю тэхналагічную незалежнасць.

На арбіце Зямлі працуюць нашы спадарожнікі. Сумесна з Расіяй ствараем новыя.

Вядома, гісторыя ствараецца не толькі прарыўнымі распрацоўкамі і ўдарнай працай на вытворчасці.

Я дзякую ўсім, хто выхоўвае і вучыць нашых дзяцей, лечыць і ратуе жыцці. Без гэтага не можа быць прарыўных тэхналогій.

Усім, хто забяспечвае ўтульнасць і прыгажосць роднай Беларусі, развівае сферу паслуг, узбагачае нашу культуру, дапамагае старым і людзям, якія маюць патрэбу ў асаблівым клопаце.

Усім, хто ахоўвае наш мірны сон і абараняе асновы беларускай дзяржаўнасці, адстойвае інтарэсы краіны за мяжой.

Наша з вамі штодзённая праца і тыя намаганні, якімі мы ствараем дабрабыт Беларусі, і ёсць цана незалежнасці. Цана, пра якую я ўвесь час гавару. Больш пакуль не патрэбна.

Ствараючы, мы становімся мацнейшымі. Становімся мацнейшымі — гарантуем незалежнасць і мір на роднай зямлі. Вось і ўся філасофія жыцця. Вось і ўвесь сэнс Года міру і стваральнай працы.

Мы шмат зрабілі, плануем у нас яшчэ больш.

І я жадаю ўсім вам новых прафесійных дасягненняў, шчасця, моцнага здароўя.

Беражыце родную зямлю, мір, традыцыі. Беражыце сябе і сваіх дзяцей.

І не хвалюйцеся! Я ведаю, вы крыху перажываеце, хвалюецеся.

Усё будзе нармальна, часам нават добра.

*(Апладысменты.)*

Таму што ў вас ёсць мы, нашае пакаленне, здольнае вас абараніць! І ніякая зброя нам не страшная. Ні ядзерная. І ніякія «харугвы» і «палкі» нам не страшныя. І не толькі таму, што ў нас няма ПВК «Вагнер».

*(Апладысменты.)*

Не тэма сённяшняга дня. Калі-небудзь мы на гэтую тэму пагаворым. Скажу толькі адно. Калісьці я вам на вялікім форуме казаў: калі вы не ведаеце, што рабіць у той ці іншай сітуацыі, а вашы ворагі гвалтам крычаць, рабіце ўсё наадварот. Калі яны крычаць, што ядзерная зброя — гэта дрэнна, рабіце наадварот.

*(Апладысменты.)*

Прывяду вам прыклад. Цяпер збеглыя, а ўчора тыя, што рваліся да ўлады, крычалі: «Прыйдзем да ўлады, Беларускую АЭС знішчым, яна нам не патрэбна». Чаму так казалі? Бо ім падказвалі адтуль, і найперш ад нашых суседзяў — Польшчы, Літвы.

А што яны сёння гавораць? Літва запланавала будаўніцтва сабе новай атамнай станцыі. Замест той, якую знішчылі. Польшча ажно дзве ці тры плануе пабудаваць. А чаму нашым дурням казалі: «Не трэба будаваць, трэба знішчыць»? А канкурэнты нікому не патрэбны. Той, хто сёння не жыве прарыўнымі, сучаснымі, суперсучаснымі тэхналогіямі — дзяржава загнівае, паміраючая.

Ядзерная энергетыка — гэта суперсучасная тэхналогіі. Калі прыродны газ падскочыў да $2 тыс. за кубаметр, а мы з вамі спажывалі па $120. У іх $2 тыс., а ў нас $120 было.

*(Апладысменты.)*

Дык вось, калі, прабачце мне, скажу ненарматыўнай лексікай, «дурніца» для іх скончылася расійская — танныя газ і нафта, — яны пачалі казаць, што ядзерная энергетыка — гэта зялёная энергетыка, яна самая бяспечная і ягэ трэба развіваць.

Немцы ціхенька тое, што планавалі закрыць, адтэрмінавалі закрываць. Французы (яны ўмеюць будаваць атамныя станцыі, усяго 5-6 краін у свеце) пачалі будаваць новыя станцыі. Па ўсім свеце, дарэчы. Гэтак жа, як амерыканцы, японцы, карэйцы і іншыя. Гэта я проста вяртаю вас у недалёкае мінулае, сведкамі якога вы былі. І калі б мы адступілі ад гэтага, мы б сёння закуплялі на 5-6 млрд больш кубоў газу прыроднага. Няхай ён сёння танны, але некалі ён быў дарагі і падаражэе. А гэта самая танная, самая бяспечная энергетыка. Але галоўнае — яна нам патрэбна.

Дакладна так яны сёння гавораць пра ядзерную зброю, якая завезена ў Рэспубліку Беларусь. Калі вы будзеце выступаць супраць гэтага, не трэба нікога крытыкаваць. Я ўжо пра гэта казаў. Гэта была мая найжорсткая ініцыятыва. І чым больш мы жывём, тым больш пераконваемся, што яна павінна ляжаць у нас, у Беларусі, у надзейным месцы. І я ўпэўнены, што нам ніколі не давядзецца яе прымяняць, пакуль яна ў нас, і ніколі на нашу зямлю не ступіць нага ворага.

*(Апладысменты.)*

Тое ж самае цяпер (не з Беларусі) раздзьмулі і раздзімаюць гэтую праблему ПВК «Вагнер» — прыватнай ваенізаванай кампаніі «Вагнер». Ды супакойцеся. Калі б можна было іх запрасіць сюды (за іх кошт), гэта для нашай арміі добра. Гэта самыя падрыхтаваныя людзі. Кажуць: «Там «зэкі». Паслухайце, усе вайскоўцы, якія там былі, асуджаныя, яны ўжо загінулі, на жаль. І яшчэ адзін нюанс, які яны (апаненты на Захадзе. — **«Зв.»**) не хочуць тлумачыць: асуджаных вызваляліся з месцаў пазбаўлення волі ў Расіі толькі для расійскага фронту. Ніводзін чалавек за мяжу не выязджае.

Дык хто ж яны, гэтыя вагнераўцы? Я ведаю іх даўно. З таго часу, памятаеце, як мы «33 волаты», па-мойму, у 2020 годзе затрымлівалі тут пад Мінскам. І яны з таго часу, мы іх з богам адпусцілі, удзячныя нам. І за Бацьку заўсёды ставяць свечку ў царкве. Яны нам не страшныя.

*(Апладысменты.)*

Гэта людзі, якія прайшлі армію, якія прайшлі войны. Гэта людзі, якія ваявалі па ўсім свеце за нармальную цывілізацыю. Захад іх ненавідзіць. І як толькі пайшоў шумок, што вось яны тут, у Беларусі, слухайце, — вал званкоў — ад тых, хто нас не прызнае. Дыктатару пачалі тэлефанаваць у Беларусь: «Гэта дрэнная рэч, гэта дрэнны сігнал!» А чаму дрэнны? Чаму для французаў дрэнны? Таму што гэтыя вагнераўцы ў Афрыцы (ведаеце, у якіх краінах) калашмацілі гэтых французаў, што толькі пыл ляцеў. Канешне, ім гэта не падабаецца.

На жаль, у нас іх няма. А калі іх хлопцы-інструктары, як я казаў ужо ім, прыедуць і перададуць баявы досвед нам, мы прымем гэты досвед. Некаторыя камандзіры ўжо гавораць аб тым: «Дашліце нам пару інструктараў. Няхай дапамогуць, няхай падкажуць».

І скажу вам абсалютна непапулярную рэч: армія толькі тады армія, калі яна ваюе. Чаму такія паспяховыя амерыканцы, як бы мы іх ні крытыкавалі? Таму што яны ўвесь час ваююць. І яны ведаюць, якую зброю вырабляць і закупляць. Гэта не наш шлях. Ваяваць — гэта не маё і, тым больш, не ваша. Я не збіраюся ваяваць. Але я 30 гадоў амаль рыхтуюся да гэтай вайны. Таму мы жывём у мірны час.

*(Апладысменты.)*

Вось такі вось несвяточны меседж. На ўсялякі выпадак. Каб вы не перажывалі і не хваляваліся. А сёння мы жывём пад мірным небам. І я чарговы раз хачу павіншаваць вас са святам.

З Днём Незалежнасці! Жывіце доўга і будзьце здаровыя!

*(Апладысменты.)*

# АСНОВА ПАЛІТЫЧНАГА КУРСУ — ЗАЎСЁДЫ ЧАЛАВЕК І СПРАВЯДЛІВАЕ СТАЎЛЕННЕ ДА ЯГО

**З выступлення Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Н. І. КАЧАНАВАЙ на закрыцці дзясятай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання**



Час паказаў, што **ўсенародна прынятае рашэнне** аб падтрымцы абноўленага Асноўнага Закона — абсалютна правільнае. Ва ўмовах знешнепалітычнай турбулентнасці, якая не спадае, барацьбы сусветных гульцоў за рэсурсы і ўплыў **унікальная беларуская мадэль развіцця** пераканаўча даказала сваю эфектыўнасць.

Насуперак знешняму ціску і беспрэцэдэнтным санкцыям **Беларусь не адмовілася ад ніводнага са сваіх пастулатаў**. Наша краіна ўпэўнена ідзе сваім суверэнным шляхам, падаючы многім прыклад міралюбівай, сапраўды дэмакратычнай, сацыяльнай, прававой дзяржавы. Гэта самае галоўнае — людзі вераць у Беларусь і звязваюць з ёй свой лёс, лёс сваіх дзяцей і ўнукаў.

Безумоўна, шмат у чым — дзякуючы нашаму нацыянальнаму лідару, Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь, шаноўнаму Аляксандру Рыгоравічу Лукашэнку. Пад мудрым кіраўніцтвам кіраўніка дзяржавы наша краіна набірае ўсё большую палітычную вагу на міжнароднай арэне, нязменна выступаючы **донарам стабільнасці і бяспекі ў Еўропе, ініцыятарам міжнародных аб'яднальных праектаў**.

Звяртаючыся да дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і членаў Савета Рэспублікі, кіраўнік дзяржавы дакладна вызначыў нашу **галоўную мэту: «*Парламент павінен стаць цэнтрам прагрэсіўнай заканатворчасці,*** *а для рэалізацыі гэтай мэты неабходна кіравацца двума правіламі.*

*Першае — прынятыя праўкі і законы перш за ўсё павінны адлюстроўваць рэальныя патрэбы нашых грамадзян.*

*Другое — наступствы любых зьмяненняў у заканадаўстве павінны быць прааналізаваныя і пралічаныя на некалькі гадоў наперад, каб людзі разумелі, куды мы ідзём і чаго хочам»*.

Менавіта таму работа Савета Рэспублікі ажыццяўляецца пад дэвізам: **«Няма пытанняў не нашых — усё, што хвалюе людзей, — гэта адказнасць парламентарыяў»**.

Як мудра навучае кіраўнік дзяржавы: «*Законы, а таксама дзейнасць і асабісты прыклад людзей, якія сёння з'яўляюцца лідарамі меркаванняў, — прадстаўнікоў улады, навуковай і творчай інтэлігенцыі — павінны працаваць на вырашэнне ўсіх жыццёва важных пытанняў*».

Арыенціраm у рабоце з насельніцтвам дзеючага парламента вызначаны **паступовы пераход ад патэрналісцкай мадэлі да падтрымлівальнай**, калі дзяржава не проста бярэ на сябе вырашэнне ўсіх праблем чалавека, а стварае такія ўмовы, каб чалавек самастойна мог іх вырашаць. Пры гэтым дапамога сацыяльна неабароненым катэгорыям ёсць і будзе адным з вектараў нашай палітыкі, а Беларусь нязменна застанецца сацыяльнай дзяржавай.

Члены Савета Рэспублікі, па сутнасці, штодзень удзельнічаюць у вырашэнні хвалюючых грамадзян пытанняў. Сёлета разгледжана каля 3 тысяч зваротаў, праведзена 63 прамыя тэлефонныя ліні, 243 асабістыя прыёмы, 447 сустрэч з працоўнымі калектывамі і па месцы жыхарства.

Кожны жыхар, не выязджаючы за межы свайго рэгіёна, меў магчымасць звярнуцца непасрэдна да прадстаўніка вышэйшага заканадаўчага органа, а за адзін дзень прыёму да членаў Савета Рэспублікі паступала больш зваротаў, чым за цэлы год у асобных райвыканкамы.

Эфектыўнасць такой формы работы абумоўлена тым, што па выніках адзіных дзён прыёмаў праводзяцца пашыраныя пасяджэнні Прэзідыума Савета Рэспублікі з удзелам актыву і дэпутацкага корпуса, дзе разглядаюцца характэрныя для рэгіёна і ў цэлым краіны праблемы і выпрацоўваюцца аптымальныя шляхі іх вырашэння.

Не менш важным з'яўляецца выкарыстанне механізмаў прамой камунікацыі з насельніцтвам, узаемадзеянне ў зручным для грамадзян фармаце. Перш за ўсё гэта правядзенне прамых тэлефонных ліній.

Пра іх значнасць, актуальнасць і запатрабаванасць сярод насельніцтва сведчаць лічбы. Так, напрыклад, падчас нядаўняй прамой тэлефоннай ліні было зафіксавана, паводле звестак Белтэлекама, 125 тыс. спроб дазвонаў. Як бачым, у людзей ёсць вялікі запыт на дыялог з уладай і яму трэба адпавядаць.

Больш за тое, гэтая форма работы з насельніцтвам набыла ў Савеце Рэспублікі новую агранку і атрымала высокую ацэнку грамадзян. Маецца на ўвазе новы фармат узаемадзеяння кіраўніцтва Савета Рэспублікі з насельніцтвам — **«званок ад спікера»**. У яго рамках рэгулярна вядзецца прамы дыялог з людзьмі, аператыўна вырашаюцца іх праблемы. Такі падыход дэманструе даступнасць улады, садзейнічае павышэнню аўтарытэту і даверу да яе.

**Спектр зваротаў**, якія паступаюць у Савет Рэспублікі, за перыяд, які разглядаецца, кардынальных змен не зведаў. Пераважная большасць (60 працэнтаў) пытанняў датычылася кампетэнцыі работы мясцовых органаў улады (ЖКГ, землеўпарадкаванне, будаўніцтва жылля, ахова здароўя і іншыя). Разам з тым грамадзян хвалявалі і перспектывы далейшага развіцця іх рэгіёнаў, краіны ў цэлым, не асабістыя пытанні, а развіццё краіны.

Эфектыўнымі і запатрабаванымі формамі работы з насельніцтвам з'яўляюцца **сустрэчы з працоўнымі калектывамі, удзел у рабоце інфармацыйных груп, дыялогавых і дыскусійных пляцоўках**. Часта менавіта на такіх сустрэчах нам паступаюць ініцыятывы, якія становяцца прадметам абмеркавання пры падрыхтоўцы праектаў нарматыўных прававых актаў.

Асаблівая ўвага Саветам Рэспублікі ўдзяляецца **ўзаемадзеянню з моладдзю**. Праводзяцца сустрэчы з навучэнцамі школ, гімназій і каледжаў, у ходзе якіх акцэнтуецца ўвага на пытаннях грамадзянска-патрыятычнага выхавання, захавання гістарычнай памяці і рэалізацыі дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі.

Павышэнню статусу сям'і ў беларускім грамадстве будзе прысвечана асобнае маштабнае мерапрыемства Савета Рэспублікі, якое мы запланавалі на канец жніўня.

У ліку прыярытэтных задач, якія стаяць у тым ліку і перад намі, — фарміраванне эфектыўнай рэгіянальнай палітыкі і ўзмацненне ролі органаў мясцовага кіравання, самакіравання ў забеспячэнні сацыяльна-эканамічнага развіцця рэгіёнаў. Гэта адзін з ключавых напрамкаў, вызначаных VI Усебеларускім народным сходам.

Сапраўды, многія пытанні, якія разглядаюцца падчас сесіі, знаходзяцца **на стыку эканомікі, сацыяльнай сферы і рэгіянальнай палітыкі**. Неабходна знайсці правільны баланс, які забяспечвае справядлівасць, чаго настойліва патрабуе ад нас кіраўнік дзяржавы: «*У справядлівасці сутнасць нашай палітыкі, і адступлення ад гэтага прынцыпу быць не можа*».

Новай формай супрацоўніцтва стала **запрашэнне службовых асоб з рэгіёнаў** на пасяджэнні сесій, экспертных саветаў і іншыя мерапрыемствы, якія мы арганізоўваем.

Гэты фармат дазваляе мясцовым органам кіравання і самакіравання не толькі знаёміцца з заканадаўчай практыкай нашай палаты, але і ўдзельнічаць у гэтай рабоце і дзяліцца назапашаным вопытам. У сваю чаргу Савет Рэспублікі атрымлівае прапановы з месцаў, якія ўлічваюцца пры падрыхтоўцы законапраектаў. Сёння мы павінны **аператыўна і рашуча рэагаваць на рэзанансныя праблемы, якія ўзнімаюцца ў рэгіёнах**.

Складанасць цяперашняга перыяду перш за ўсё ў зацягнутым крызісе міжнародных адносін, якія характарызуюцца высокай турбулентнасцю, **вялікай напружанасцю і канфліктнасцю**.

Відавочна, што простых рашэнняў няма і не будзе. Усе яны шмат у чым залежаць ад узроўню дыпламатычных узаемаадносін з нашымі стратэгічнымі партнёрамі, ад колькасці і якасці дзелавых кантактаў па ўсім свеце.

Наш Прэзідэнт неаднаразова падкрэслівае, наколькі важна развіваць супрацоўніцтва з усімі, хто па-добраму ставіцца да нашай краіны і нашага народа.

**Расійская Федэрацыя** — наш стратэгічны партнёр у эканамічнай, палітычнай і ваеннай сферах. Беларуска-расійскае добрасуседства праверана часам. Паступальна развіваецца супрацоўніцтва з рэгіёнамі Расіі.

Усе мы застаёмся пад вялікім уражаннем ад нядаўняга **X, юбілейнага, Форуму рэгіёнаў Расіі і Беларусі** ў выдатным горадзе Уфе Рэспублікі Башкартастан. Як вы ведаеце, абноўлены абсалютныя рэкорды форуму: падпісана каля **100 пагадненняў** аб супрацоўніцтве, заключана кантрактаў на суму **каля 110 млрд** расійскіх рублёў. Умацоўваецца супрацоўніцтва **з парламентамі краін СНД**.

Многія краіны і народы рэальна ацэньваюць тое, што адбываецца ў свеце, і гатовы развіваць узаемавыгадныя адносіны з Беларуссю. У поўнай меры неабходна задзейнічаць патэнцыял парламенцкай дыпламатыі ў наладжванні дыялогу з усімі **дзяржавамі Паўднёва-Усходняй Азіі, Блізкага Усходу**.

Неад'емнай часткай нашай работы на ўсіх міжнародных пляцоўках з'яўляецца актыўнае прасоўванне пазіцыі аб недапушчальнасці ўмяшання ва ўнутраныя справы дзяржаў. Агучаная мною ініцыятыва аб стварэнні спецыяльнай **міжнароднай інстанцыі па абароне нацыянальных выбараў** з натхненнем была ўспрынята ў медыяполі і экспертнай супольнасці. Гэта яшчэ раз пацвярджае салідарнасць многіх краін у сваім імкненні да самастойнага развіцця.

**Пазіцыя Беларусі нязменная: канфрантацыя — не наш шлях**. Наша краіна гатовая да супрацоўніцтва на прынцыпах канструктыўнага, раўнапраўнага і ўзаемапаважлівага дыялогу.

Мы прагнем узаемадзейнічаць з усімі, настойліва прасоўваючы міралюбівыя і аб'яднальныя знешнепалітычныя ініцыятывы нашага Прэзідэнта, глыбокапаважанага Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі.

**Самае галоўнае дасягненне беларускай дзяржавы** ў такія рэкордна кароткія па гістарычных мерках тэрміны — гэта тое, што захаваны і прымножаны найлепшыя традыцыі папярэдніх пакаленняў. На працягу больш як чвэрці стагоддзя наша краіна дэманструе прыхільнасць нацыянальным інтарэсам і галоўным мэтам дзяржаўнага развіцця, а ў аснове палітычнага курсу — заўсёды чалавек і справядлівае стаўленне да яго.

# ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ СУВЕРЭНІТЭТ, МІРНУЮ СТВАРАЛЬНУЮ ПРАЦУ І САЦЫЯЛЬНУЮ СПРАВЯДЛІВАСЦЬ

**З выступлення Старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь У. П. АНДРЭЙЧАНКІ на закрыцці дзявятай сесіі Палаты прадстаўнікоў сёмага склікання**



З улікам абноўленай Канстытуцыі сесійны перыяд доўжыўся больш за дзевяць месяцаў. Гэта дазволіла дэпутацкаму корпусу аператыўна вырашаць пытанні, якія закранаюць інтарэсы кожнага беларуса, — ад канстытуцыйнай рэформы да насельных навацый у сферах адукацыі і медыцыны. Намі прынята больш як сто новых і перапрацаваных заканадаўчых актаў.

Якія б законапраекты ні абмяркоўваліся ў Авальнай зале, яны заўсёды разглядаліся з пункту гледжання забеспячэння суверэнітэту, мірнай стваральнай працы і сацыяльнай справядлівасці — дэмакратычных каштоўнасцяў, якія, паводле слоў Прэзідэнта, складаюць аснову нашай нацыянальнай ідэі.

Праведзена сапраўды вялікая, карпатлівая работа. У ёй узялі ўдзел усе структуры ўлады і грамадзянскай супольнасці. Прынцыпова важна, што ў парламенцкай практыцы глыбока ўкаранілася традыцыя народнай заканатворчасці. Значныя для будучыні краіны дакументы абмеркаваны на дыялогавых пляцоўках, выязных семінарах-нарадах, у працоўных калектывах.

Галоўным вынікам сесіі стала прывядзенне заканадаўства ў адпаведнасць з абноўленай Канстытуцыяй. Асноўныя задачы выкананы. На ўзроўні закона ўрэгуляваны пытанні дзейнасці Усебеларускага народнага сходу. Скарэкціраваны паўнамоцтвы ключавых дзяржаўных органаў. Створаны новая архітэктура палітычнай сістэмы і неабходныя ўмовы для правядзення выбараў, якія павінны адбыцца.

Разам з тым работу над законамі, запланаванымі да прыняцця ў развіццё палажэнняў Канстытуцыі (а іх засталося каля дзесяці), трэба завяршаць у найбліжэйшы час. Такую задачу парламентарыям паставіў кіраўнік дзяржавы.

Асаблівая ўвага на сесіі была аддадзена забеспячэнню нацыянальнай бяспекі ва ўсіх яе аспектах — палітычным, абаронным, эканамічным, сацыяльным.

Самую жорсткую пазіцыю дэпутаты занялі ў пытаннях адстойвання гістарычнай праўды, захавання пераемнасці пакаленняў, нацыянальнай ідэнтычнасці і традыцыйных духоўна-маральных каштоўнасцяў.

Аднак бяспека — гэта перш за ўсё эканоміка, гібкая, устойлівая, самадастатковая. У сувязі з гэтым парламентарыямі прыняты меры па забеспячэнні збалансаванасці і дынамічнага развіцця нацыянальнай эканомікі, мінімізацыі ўплыву санкцый на паўсядзённае жыццё нашых грамадзян. Асаблівы акцэнт зроблены на падтрымцы нацыянальнага бізнесу і абароне працоўных калектываў.

Але і тут у нас яшчэ застаецца шэраг сур'ёзных пазіцый — абнаўленне Грамадзянскага кодэкса, карэкціроўка законаў па пытаннях прадпрымальніцтва, дзяржаўных закупак. Трэба максімальна актывізаваць работу па іх прыняцці. У роўнай ступені гэта адносіцца і да падрыхтоўкі пакета бюджэтна-падатковых дакументаў на 2024 год.

У цэлым далейшая заканатворчая дзейнасць павінна будавацца ў адпаведнасці з Канцэпцыяй прававой палітыкі, зацверджанай кіраўніком дзяржавы 28 чэрвеня гэтага года. Заканадаўства павінна аператыўна рэагаваць на існуючую сітуацыю і папярэджваць магчымыя выклікі і пагрозы.

У такім жа ключы неабходна падыходзіць і да ажыццяўлення праграм міжпарламенцкай дзейнасці. Наша асноўная задача — садзейнічаць рэалізацыі міралюбівага знешнепалітычнага курсу краіны, прасоўванню мірнага, аб'яднальнага парадку. Імідж Беларусі як надзейнага і адказнага партнёра павінен пастаянна пацвярджацца канкрэтнымі справамі і прыносіць у канчатковым выніку эканамічную аддачу.

Мірныя ініцыятывы беларускай дзяржавы знаходзяць пазітыўны водгук. Усё больш дзяржаў дэманструюць гатоўнасць удзельнічаць у стварэнні светапарадку, заснаванага на павазе суверэнітэтаў, культурна-гістарычнай разнастайнасці, даверы і эфектыўным эканамічным супрацоўніцтве. Не выклікае сумнення, што мадэль свету, заснаванага на заходніх правілах, дзе ключавым з'яўляецца прынцып уласнай перавагі, павінна трансфармавацца ў свет роўных магчымасцяў і ўзаемнай павагі. Але пабудаваць такі свет можна толькі пры ўліку інтарэсаў усіх бакоў. Гэтую ідэю нам трэба настойліва прасоўваць на ўсіх узроўнях і ва ўсіх фарматах міжпарламенцкага дыялогу.

Выбары, якія маюць адбыцца, у многім вызначаюць асноўныя прыярытэты работы ў выбарчых акругах. Перш за ўсё нельга зніжаць увагу да работы са зваротамі грамадзян.

Трэба працягваць адкрыты грамадскі дыялог. Людзі павінны з першых вуснаў атрымліваць інфармацыю аб мерах, якія прымаюцца ў краіне для захавання суверэнітэту, гарантавання бяспекі і пастпальнага сацыяльна-эканамічнага развіцця. Асаблівы акцэнт трэба зрабіць на пытаннях падрыхтоўкі да правядзення Усебеларускага народнага сходу і абмеркавання праекта Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі.

Вялікі патэнцыял у плане падтрымання народнага адзінства змяшчаюць мерапрыемствы, якія праводзяцца ў рамках Года міру і стваральнай працы. Важна развіваць сістэму патрыятычнага выхавання моладзі, садзейнічаць захаванню гістарычнай памяці, культурнай і духоўнай спадчыны Беларусі.

*Поўныя тэксты выступленняў чытайце на сайце zviazda.by*

Уражанні

# «Калі будзем будаваць дом, выкарыстаем некаторыя ідэі»

## Палац Незалежнасці натхняе сваіх гасцей

**Напярэдадні Дня Незалежнасці наведаць Палац Незалежнасці больш памятна, чым калі-небудзь яшчэ. Аспрэчваць значэнне гэтага свята і ролю гэтага збудавання, якое часта называюць сімвалам нашага суверэнітэту, не будзе ніхто. У святочныя дні Палац Незалежнасці наведалі супрацоўнікі Міністэрства інфармацыі і ЗАТ «Другі нацыянальны тэлеканал».**




Здавалася б, што тут незвычайнага? Журналісты і супрацоўнікі міністэрства па доўгу службы бываюць у палацы часта, некаторыя амаль кожны дзень. Але гэтым разам рабочую Рэзідэнцыю Прэзідэнта наведалі тыя, хто ўносіць свой уклад у фарміраванне беларускага медыяполя, застаючыся «за кадрам». Міністэрства інфармацыі на экскурсіі прадстаўлялі супрацоўнікі структурных падраздзяленняў: інфармацыйна-аналітычнага ўпраўлення, упраўленняў прававога забеспячэння і кантролю за выкананнем заканадаўства, электронных СМІ і інтэрнэт-рэсурсаў, выдавецкай і паліграфічнай дзейнасці, а таксама эканамічнай, бухгалтарскай, кадравай службаў ведамства, супрацоўнікі аддзела справаводства. Група ЗАТ «Другі нацыянальны тэлеканал», які з'яўляецца заснавальнікам тэлеканала АНТ, уключала нараўне з кіраўніцтвам супрацоўнікаў розных дырэкцый: тэхнічнага забеспячэння, праграмнай, маркетынгу і продажаў, радыё, інфармацыйнай, ранішняга вяшчання, агульнага і кадравага аддзелаў, бухгалтэрыі. Большасць з іх упершыню наведвала Палац Незалежнасці. І гэта зусім не выпадкова. З адкрыцця Палаца Незалежнасці ў 2013 годзе патрабаванне кіраўніка дзяржавы застаецца нязменным — палац павінен быць адкрытым для беларусаў і тут хаця б адзін раз павінен пабываць кожны грамадзянін нашай краіны. Улічваючы, што экскурсіі ў палацы праводзяцца часта, а колькасць ахвотных расце, даручэнне Прэзідэнта выконваецца старанна.





«У Палацы Незалежнасці я першы раз і вельмі ўдзячная за магчымасць наведаць гэта месца. Выдатны будынак, вельмі напоўнены, насычаны. Мы вельмі ўражаны ўсім, што тут прадстаўлена. Пачынаючы ад карцін і фатаграфій з выявай памятных мясцін і славутасцяў Беларусі і заканчваючы беларускай атрыбутыкай, сімволікай, якой напоўнены палац. Усё вельмі прыгожае і прыбранае, урачыстае. Мы можам ганарыцца, што ў нас ёсць такія аб'екты і людзі, якія змаглі гэта стварыць. Разам з прафсаюзным актывам міністэрства мы наведваем шмат цікавых мясцін нашай краіны. І Палац Незалежнасці — гэта месца, дзе абавязкова трэба пабываць беларусам», — у размове з журналістамі падзялілася **Святлана ДРЭБЕЗАВА, начальнік аддзела дакументаабароту і матэрыяльнага забеспячэння Міністэрства інфармацыі.**

Па добрай традыцыі экскурсанты ў Палацы Незалежнасці прыходзяць сем'ямі. Асабліва тут рады дзецям і моладзі, пра гэта таксама неаднойчы згадваў кіраўнік дзяржавы. **Супрацоўніца тэлеканала АНТ Наталля ТКАЧЭНКА** на экскурсію прыйшла разам з сынам Уладзіславам. Найлепшая форма адкрытага ўрока па патрыятычным выхаванні. Менавіта гэтым, па словах Наталлі, яна і кіравалася. «Мы з задавальненнем адгукнуліся на прапанову наведаць Палац Незалежнасці. Калі будзем будаваць свой дом, выкарыстаем некаторыя ідэі, напрыклад, мне вельмі падабаецца, што шмат святла, асабліва спадабалася колеравая гама, прастора», — расказала Наталля Ткачэнка.

**Інжынер дырэкцыі тэхнічнага забеспячэння тэлеканала АНТ Сяргей МАСАЛБАСАЎ** прыйшоў на экскурсію разам з жонкай Вольгай. «Як заходзіш сюды, у палац, адразу зачароўвае веліч гэтых сцен, магутнасць самога палаца. Эмоцыі перапаўняюць, усё вельмі прыгожа, адчуваеш гонар за краіну, захапленне», — падзялілася ўражаннямі пара. Асабліва, па словах Сяргея, захоплівае атмасфера гістарычнай значнасці падзей, якія адбываюцца ў гэтых сценах. Па яго словах, гэта вельмі адчуваецца.

«Для кожнага грамадзяніна Беларусі Палац Незалежнасці — культавае, знакавае месца. З прычыны спецыфікі работы мы далёка не заўсёды маем магчымасць зазірнуць у закулісse палітычнай кухні Беларусі, а сёння гэта адбылося. Упэўнены, што кожны, хто хаця б раз пабывае ў гэтым месцы, адчуе ўсю сілу і моц культавага будынка. Гэта вельмі манументальна і захапляльна. Уражанні проста каласальныя. Упэўнены, што яны застануцца надоўга!» — адзначыў **галоўны спецыяліст інфармацыйна-аналітычнага ўпраўлення Міністэрства інфармацыі Міхаіл ДЗЕГЦЯРЭНКА.**

**Валерыя СЦЯЦКО.**

**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

---

Абітурыент-2023

# СТАЦЬ СТУДЭНТАМ — ПРАЗ УНІВЕРСІТЭЦКІЯ АЛІМПІЯДЫ

## Прадстаўнікі прыёмных камісій запэўніваюць: гэта самы кароткі шлях...

**З бягучага года ў Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Янкі Купалы пачнуць рыхтаваць архітэктараў. Адпаведная спецыяльнасць упершыню адкрываецца на інжынерна-будаўнічым факультэце. Пра гэта паведаміла на прэс-канферэнцыі «Уступная кампанія на прыкладзе Гродзенскай вобласці» адказны сакратар прыёмнай камісіі Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы Ірына КАРЛЮКОВА. Пры паступленні на новую спецыяльнасць прадугледжаны ўступны іспыт па творчасці, які здаецца непасрэдна ва ўніверсітэце. Пасля шасці гадоў навучання выпускнік атрымае кваліфікацыю «Архітэктар» і ступень магістра.**

Ірына Карлюкова таксама нагадала, што летась ва ўніверсітэце адкрыліся яшчэ некалькі новых перспектыўных спецыяльнасцяў «Аналітычная біяхімія», «Біяхімія лекавых сродкаў» і «Вэб-журналістыка». Каб быць у курсе ўсіх спраў, абітурыентам варта часцей зазіраць на сайце ўніверсітэта ў раздзел "Як паступіць?" «Уступная кампанія 2023: ад «А» да Я», дзе кожны тыдзень з'яўляюцца новыя стрымы. З іх можна даведацца пра адметнасці таго ці іншага факультэта, кожную спецыяльнасць, навуўведзенні прыёмнай кампаніі, жыццё студэнтаў па-за вучобай, пра студэнцкі гарадок і гэтак далей. Сёлета план прыёму на дзённую форму навучання ў Купалаўскім універсітэце складае 1166 чалавек. 163 абітурыенты ўжо сталі студэнтамі: 128 з іх паступілі ў рамках мэтавага набору і 35 — па выніках праведзеных унутрыўніверсітэцкіх алімпіяд.

У Гродзенскім дзяржаўным медыцынскім універсітэце студэнтамі першага курса сталі 16 абітурыентаў, якія перамаглі ва ўнутрыўніверсітэцкай алімпіядзе. **Адказны сакратар прыёмнай камісіі гэтай ВНУ Фаціма ГАДЖЫЕВА** параіла абітурыентам абавязкова скарыстацца новай магчымасцю, якую атрымалі рэгіянальныя ўніверсітэты, у наступную прыёмную кампанію — паспрабаваць свае сілы яшчэ да старту асноўнай уступнай кампаніі.

— Гродзенскі медуніверсітэт — брэндавая ўстанова. Сёлета ён адзначыць сваё 65-годдзе.Таму ўсім, хто стане нашымі першакурснікамі, пашчасціць паўдзельнічаць у шматлікіх мерапрыемствах, прымеркаваных да юбілею, — падкрэсліла Фаціма Гаджыева. — На цяперашні момант ва ўніверсітэце навучаюцца 4614 студэнтаў. Гродзенскі медуніверсітэт — адзіны профільны ўніверсітэт у краіне, дзе адкрыты медыка-псіхалагічны факультэт. Там рыхтуюць спецыялістаў па трох кірунках: псіхіятр-нарколаг, урач-псіхатэрапеўт і ўрач-неўролаг. Самы малады ва ўніверсітэце — медыка-дыягнастычны факультэт, дзе рыхтуюць спецыялістаў па профілі інструментальнай і лабараторнай дыягностыкі, рэнтгеналагічнай дыягностыкі і ўльтрагукавой дыягностыкі. Размова ідзе менавіта пра дыягностаў, якія не займаюцца ўрачэбнай практыкай, таму навучанне вядзецца пяць гадоў. Таксама ў Гродзенскім медуніверсітэце можна атрымаць вышэйшую медыцынскую сястрынскую адукацыю. У гэтым годзе будзе весціся набор ахвотных стаць медыцынскай сястрой з вышэйшай адукацыяй на завочную платную форму навучання. На гэтыя мэты выдзелена 30 месцаў. Умова — наяўнасць сярэдняй спецыяльнай медыцынскай адукацыі.

Па словах Фацімы Гаджыевай, 16 чэрвеня ва ўніверсітэце завяршыўся набор на мэтавую падрыхтоўку, якая становіцца для медыцынскіх ВНУ цяпер асноўнай. Так, напрыклад, на педыятрычным факультэце мэтавы набор даходзіць да 80 працэнтаў ад агульнай колькасці бюджэтных месцаў. Усяго план набору ў медуніверсітэт складае ў гэтым годзе 665 чалавек, але 320 месцаў ужо занятыя хлопцамі і дзяўчатамі, якія паступалі ў рамках мэтавага набору. Сярэдні конкурс на адно мэтавае месца склаў 1,5 чалавека. Такім чынам, на бюджэтнай форме навучання засталося 154 месцы і 175 месцаў — на платнай форме навучання.

З 15 чэрвеня ў Гродзенскай вобласці, як і ў астатніх рэгіёнах краіны, пачалася ўступная кампанія на ўзровень прафесійна-тэхнічнай адукацыі. Пра гэта паведаміў **начальнік аддзела прафесійнай адукацыі галоўнага ўпраўлення адукацыі Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта Андрэй БАТУРА.**

— У 2023—2024 гадах мы плануем арганізаваць адукацыйны працэс па 40 спецыяльнасцях і 70 кваліфікацыях, а таксама адкрыць і аднавіць падрыхтоўку па найбольш запатрабаваных для рэгіёна спецыяльнасцях і кваліфікацыях. Так, у Лідскім дзяржаўным політэхнічным каледжы плануецца ажыццяўляць падрыхтоўку па прафесіі выдзімальнік шкловырабаў, у Мірскім дзяржаўным каледжы адновяць прыём па кваліфікацыі «Рэстаўратар помнікаў каменнага дойлідства», — падкрэсліў Андрэй Батура. — Трэба нагадаць, што сёлета прыём мы ажыццяўляем па новым дзяржаўным класіфікатары спецыяльнасцяў і кваліфікацый. Таму калі раптам нехта ў даведніках не знойдзе для сябе звыклую назву спецыяльнасці, не варта хвалявацца. Практычна ўсе раней вядомыя прафесіі ў гродзенскіх каледжах засталіся, усю дадатковую інфармацыю пра іх можна даведацца на сайтах устаноў адукацыі або ўдакладніць па тэлефонах прыёмных камісій.

На ўзровень сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў 2023 годзе ва ўстановы Гродзеншчыны плануюць прыняць больш за 4 тысячы навучэнцаў. План мэтавай падрыхтоўкі складае 542 чалавекі, або 30 % ад кантрольных лічбаў прыёму на дзённую бюджэтную форму. На ўзроўні сярэдняй спецыяльнай адукацыі плануецца арганізаваць працэс па 26 спецыяльнасцях і 28 кваліфікацыях.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Імя салдата

# ОРДЭН ПАШКАДАВАЛА-ЗБЕРАГЛА І ЧУЖАЯ ЗЯМЛЯ

## Беларус вярнуўся дадому амаль праз восемдзесят гадоў

**Ганне Дзмітрыеўне Шашковай з Гомеля — хутка 91 год. Колькі хапіла здароўя — амаль да 80-ці — яна працягвала жыць у роднай вёсцы Верхняя Алба, што ў Жлобінскім раёне. Моцна трымалі на роднай зямлі карані — на вясковых могілках пахаваны маці з бацькам. У гэтыя дні ў жанчыны туга па роднай вёсцы зусім нязносна зашчаміла сэрца — так хацелася ёй зноў вярнуцца на малую радзіму. Але Ганна Дзмітрыеўна не ходзіць. Яна плакала-прасіла сваіх дачок пакланіцца яе бацькам у той зямлі і перадаць, што яна апошняя дачакалася...**



Знойдзеныя ўзнагароды цяпер захоўваюцца ў сям'і Ганны Дзмітрыеўны ШАШКОВАЙ.



Ордэн Чырвонай Зоркі і медаль «За адвагу», па якіх праз 73 гады ўдалося высветліць лёс савецкага байца.

Гэта гісторыя пра сям'ю Мядзведзевых з вёскі Верхняя Алба: бацькоў Ганны Дзмітрыеўны — Веру Цімафееўну і Дзмітрыя Рыгоравіча і іх трох сыноў, якіх маці з бацькам у Вялікую Айчынную так і не дачакаліся з фронту.

— Трое маміных братоў пайшлі ваяваць, і ўсе трое прапалі без вестак. Ні мама, ні мы не хацелі мірыцца з фармулёўкай «лічыцца без вестак зніклым». Шукалі хоць якой-небудзь інфармацыі пра трох братоў Мядзведзевых, — тлумачаць дочкі Ганны Дзмітрыеўны — Таццяна Іванаўна Давыдзенка і Алена Іванаўна Грышачкіна.

Іх маці добра памятае, як старэйшыя браты пайшлі на фронт, хоць ёй было толькі дзевяць, як вайна пачалася. Добра памятае жанчына, і як яе маці Вера Цімафееўна Мядзведзева, хоць і не атрымала «пахаронкі» на сыноў, адчувала: хлопцы яе загінулі на полі бою.

